

# ЗАЛАТЫ ЛІСТАПАД

**Па гарызанталі: 1.** «... напеву -// Зноўку лістапад». З верша М.Яцкова «Зноўку лістапад». **5.** Зборшчык і ўстаноўшчык машын, абсталявання. **8.** У лістападзе ... скрозь слёзы і «белых мух» усміхаецца (прык.). **9.** Ручная сельскагаспадарчая прылада. **10.** Плады, якія апалі ад ветру. **12.** Увосень жывёла тлусцее, а ... дабрэе (прык.). **14.** Мера зямельнай плошчы. **15.** «Перафарбавала восень клёны//У ... жоўты і чырвоны». З верша В.Шымука «Колеры восені». **18.** У матэматыцы абазначэнне невядомай велічыні. **19.** ... Сястры. Адна з народных назваў сузор'я Арыён. **20.** Вокліч з пераможнай інтанацыяй. **21.** Вялікае лісцевае дрэва. **23.** Прыемны пах, духмянасць. **29.** Нота музычнай гамы. **30.** ... або метэорны дождж; прыродная з'ява, якая часта назіраецца ў лістападзе. **31.** «Мелодыі восені — сумныя ... .//А хочацца сонца, цяпла і пяшчоты». З верша А.Жыгунова «Мелодыі восені». **32.** «Надзьмулася ... -//У небе восень». З верша Л.Паўлікавай «Лістапад».**34.** «Як охра, пажаўцела восень,//... рыхтуецца к зіме». З верша М.Сабалеўскага «Асенні малюнак». **35.** Павадка, прывычка. **36.** ... ў лістападзе — быць мяккай зіме (прыкм.).

**Па вертыкалі: 1.** Выкрык. **2.** «З буйных ліп і бяроз//... валяцца.//Між павалаў і лоз//Рассыпаюцца». З верша Я.Купалы «Лістапад». **3.** Мужчынскае імя. **4.** Тое, што і бурштын. **5.** Мадэль, папярэдні ўзор. **6.** У лістападзе ... марозу не ўказ (прык.). **7.** Пакаленне. **11.** У лістападзе мужык з калёсамі развітваецца, у ... залазіць (прык.). **13.** «Гаспадыняй крочыць восень,//Прабіраецца ў дварах,//... жухлыя пакосіць,// Лісце спаліць на кастрах». З верша Л.Воранавай «Гаспадыня восень». **16.** «У лясах, на балоце//...,//Лістапад.//І стаіць у няшчоце//Залацісты сад». З верша В.Гардзея «Залаты лістапад». **17.** ... зіме сцежку пракладае (прык.). **20.** «Дацвітае лістом і лаза і крушына//і ў імшарах лясных дагарае ... «.. З верша М.Танка «Восенню». **22.** Лістапад — ... года (прык.). **24.** Восеньскія кветкі. **25.** Кароткі перапынак. **26.** Задняя частка судна. **27.** Чарада птушак, рыб. **28.** Асяроддзе, грамадскае акружэнне. **31.** Тое, што і нізоўе. **33.** Пачатак, аснова чаго-небудзь (перан.).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**Праверце, калі ласка, адказы**

**Па гарызанталі:** 1. Золата. 5. Манцёр. 8. Сонца. 9. Каса. 10. Апад. 12. Чалавек. 14. Ар. 15. Колер. 18. Ікс. 19. Тры. 20. Ага. 21. Вяз. 23. Водар. 29. До. 30. Зарапад. 31. Ноты. 32. Неба. 34. Зямля. 35. Звычка. 36. Камары. **Па вертыкалі:** 1. Зык. 2. Лісты. 3. Астап. 4. Янтар. 5. Макет. 6. Цяпло. 7. Род. 11. Санкі. 13. Травы. 16. Ліставей. 17. Лістапад. 20. Атава. 22. Змрок. 24. Астры. 25. Паўза. 26. Карма. 27. Касяк. 28. Сфера. 31. Ніз. 33. Азы.

# Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

## Як перамагчы восеньскіх садовых шкоднікаў

**Восеньскія шкоднікі прыходзяць надоўга — яны паспяхова перажывуць зіму, і ўвесну вы іх знойдзеце роўна там, дзе пакінулі восенню. Гэта значыць, што змагацца з імі ў любым выпадку давядзецца — калі не цяпер, то праз паўгода. Дык навошта губляць час?**

**Вось некалькі парад, якія сур'ёзна ўскладняць жыццё садовым шкоднікам, а ваша, наадварот, палегчаць.**

**1.** Гнёзды залатагузкі і баярышніцы выглядаюць, як змацаванае павуцінкай засохлае лісце, і знаходзяцца яны звычайна ў кроне дрэў. Знiміце іх — разбурыце дом шкоднікаў.

**2.** Маса шкоднікаў знаходзіць сабе дом у верхнім пласце зямлі, і расправіцца з імі проста — трэба перакапаць яе. Асаблівую ўвагу надавайце прыствольным кругам, міжраддзям і градкам. Вы можаце нават не ўбачыць самі гнёзды, але мароз і галоўныя ворагі шкоднікаў — птушкі — дарогу да іх усё роўна знойдуць.

**3.** Акультураныя глебы не даспадобы насякомым — ім дрэнна ў сухой, угноенай і кіслай зямлі. А добра ў моцна вільготнай, гліністай і «цяжкай». Таму за зямлёй трэба даглядаць і не аддаваць яе на водкуп прыродзе і шкоднікам нават у тым выпадку, калі сад лічыцца «запушчаным».

**4.** Шкоднікі любяць хворыя расліны і разнастайную гнілату. Адпаведна, ваша задача — пасля завяршэння сезона акуратна апрацаваць дрэвы, прыбраўшы відавочна хворыя і сухія галінкі, а таксама збіць усе падгнілыя плады, якія засталіся, і прыбраць іх ад шкоднікаў далей.

**5.** Калі вы заўважылі на кустах і маладых дрэвах галы (утварэнні), то ведайце — там, напэўна, сабраліся зімаваць лічынкі. Уважліва агледзьце галінкі і ўсё падазронае зрэжце, а затым спаліце.

**6.** Некаторых шкоднікаў відаць няўзброеным вокам, і яшчэ не позна іх проста ўзяць і сабраць. А потым спаліць, зразумела. Наіўна думаць, што зіма іх знішчыць, а нават калі і так, то да яе надыходу шкоднікі яшчэ паспеюць пакінуць нашчадкаў, якія будуць радасна сустракаць надыход вясны. У вашым садзе.

**7.** Адмерлая кара — рассаднік разнастайных насякомых і іх лічынак. Яе трэба чысціць, асаблівую ўвагу надаючы таму, каб заадно прыхапіць як мага больш кладак і коканаў шкоднікаў. Калі ў дрэве ёсць круглыя адтуліны — гэта прыкмета таго, што там завяліся шкоднікі, якія добра схаваліся. Змагацца з імі давядзецца адпаведнай хіміяй.



**8.** Птушкі ў зімовым садзе — гэта не толькі прыгожа, але і карысна, таму што яны з'яўляюцца ворагамі нумар адзін для ўсіх шкодных насякомых. Зрабіце для іх кармушкі. Вялікі шанц, што птушкі добра «праінспектуюць» вашы дрэвы ў пошуках «дэсерту».

## Зубны парашок — натуральнае ўгнаенне

**Часта бывае, што пакаёвыя расліны стаяць з паніклымі лісточкамі — праблема з каранёвай сістэмай. Каранёвыя гнілі з'яўляюцца ад паліву халоднай вадой, ад скразнякоў. Што часта можа здарыцца ў халодную пару года.**

На дапамогу прыйдзе зубны парашок. На паўшклянкі вады спатрэбіцца: 2 ст. л. зубнога парашку, 1 ст. л. меднага купарвасу, 2 ст. л. драўнянага попелу. Попел дасць харчаванне каранёвай сістэме. Усё старанна змяшаць. Далей давядзецца адкапаць зямлю каля карэньчыка і намазаць сцяблінку гэтым растворам. Пасля гэтага трэба на тыдзень пераставіць расліну ў сухое месца.

Пакаёвыя кветкі не любяць кіслай глебы. Час ад часу іх добра падкарміць зубной пастай. На 1 літр вады — траціна цюбіка зубной пасты. Добра размяшаць, паліваць расліны цёплай вадой. Такая падкормка найбольш карысная для кветак. Кальцый паступіць у глебу і дасць харчаванне караням.

# Гараскоп стрыжак

***2 лістапада, серада.*** Стрыжка і афарбоўванне валасоў будуць вельмі ўдалымі, а вось завіўку лепш не рабіць.

***3 лістапада, чацвер.*** Спрыяльны дзень для стрыжкі і афарбоўвання ў яркія колеры. З завіўкай лепш пачакаць.

***4 лістапада, пятніца.*** Можна стрыгчыся і рабіць завіўку, умацоўваць і аздараўляць валасы. Для афарбоўвання непадыходзячы момант.

***5 лістапада, субота.*** Вельмі спрыяльны дзень для ўсіх працэдур з валасамі: можна стрыгчыся, афарбоўваць валасы, рабіць завіўку, укладку.

***6 лістапада, нядзеля.*** У гэты дзень любыя маніпуляцыі з валасамі проціпаказаныя.

***7 лістапада, панядзелак.*** Спрыяльны дзень для стрыжкі, завіўкі валасоў. Афарбоўванне не рэкамендуецца.

***8 лістапада, аўторак.*** Завіўка і колер не доўга пратрымаюцца. Стрыгчыся наогул не рэкамендуецца.

***9 лістапада, серада.*** Каб пазбегнуць непрыемнасцяў, не варта хадзіць да цырульніка.

***10 лістапада, чацвер.*** Стрыжка будзе ўдалай, а вось афарбоўванне і завіўку рабіць не рэкамендуецца — эфект ад іх захаваецца нядоўга.

***11 лістапада, пятніца.*** Лепш нічога не рабіць з валасамі. Асабліва непажадана афарбоўванне.

***12 лістапада, субота.*** Няхай сёння вашы валасы адпачнуць.

***13 лістапада, нядзеля.*** Добры час для эксперыментаў з колерам валасоў. Стрыжка і завіўка проціпаказаны.

***14 лістапада, панядзелак.*** Калі вы даўно падумваеце пра змену колеру валасоў — лепшага дня не знайсці. Завіўка таксама будзе ўдалай, але стрыгчыся нельга.

***15 лістапада, аўторак.*** Неспрыяльны дзень для стрыжкі і завіўкі валасоў, афарбоўванне наогул можа даць нечаканы вынік.

***16 лістапада, серада.*** Можна рабіць завіўку, стрыгчыся, фарбаваць валасы. Але на працяглы эфект ад працэдур разлічваць не варта.

***17 лістапада, чацвер.*** Стрыжка злёгку прыпыніць рост валасоў. Афарбоўванне і завіўка не рэкамендуюцца.

***18 лістапада, пятніца.*** Стрыгчыся, завіваць і фарбаваць валасы сёння нельга.

***19 лістапада, субота.*** Афарбоўванне валасоў сёння можа ім нашкодзіць. Стрыжка паказаная тым, хто хоча мець густыя і не вельмі паслухмяныя валасы.

***20 лістапада, нядзеля.*** Спрыяльны дзень для кароткай стрыжкі, а вось завіўку і афарбоўванне лепш не рабіць.

***21 лістапада, панядзелак.*** У другой палове дня стрыжка будзе ўдалай, асабліва кароткая. Афарбоўванне атрымаецца яркім, завіўка — трывалай.

***22 лістапада, аўторак.*** Выдатны дзень для завіўкі валасоў. Стрыгчыся варта тым, каму важна захаваць форму прычоскі даўжэй.

***23 лістапада, серада.*** Стрыжка затармозіць рост валасоў. А для завіўкі адзін з самых спрыяльных дзён. Можна і афарбоўваць валасы.

***24 лістапада, чацвер.*** Не прапусціце гэты спрыяльны дзень для завіўкі валасоў — валасы атрымаюцца натуральнымі і прыгожымі. А вось стрыгчыся не варта.

***25 лістапада, пятніца.*** Смела прызначайце на сёння завіўку — яна будзе добра трымацца. Пры гэтым лепш не афарбоўваць і не стрыгчы валасы.

***26 лістапада, субота.*** Калі хочаце зрабіць валасы гусцейшымі, з раніцы састрыжыце некалькі міліметраў. Пасля 11 гадзін увогуле не варта нічога рабіць з валасамі.

***27 лістапада, нядзеля.*** Усе працэдуры з валасамі проціпаказаныя.



***28 лістапада, панядзелак.*** Можна падстрыгаць толькі кончыкі валасоў. Афарбоўванне і завіўка могуць ператварыць валасы ў безжыццёвыя і сухія.

***29 лістапада, аўторак.*** У дзень маладзіка не варта ўвогуле чапаць валасы.

***30 лістапада, серада.*** Вельмі спрыяльны дзень для стрыжкі валасоў, асабліва калі вы хочаце, каб яны хутка раслі. Афарбоўваць таксама можна.

■ Ці чулі?

## Таксі для... чарапашкі

**У сталіцы днямі запрацавала незвычайная транспартная служба. Яе стваральнікі прапануюць кліентам перавозку па ўсёй тэрыторыі краіны дамашніх жывёл: катоў, сабак, птушак і іншых. З мая сервіс працаваў у тэставым рэжыме, цяпер жа перайшоў на пастаянную аснову.**



На сайце кампаніі заяўляюць, што аўтамабілі спецыяльна пераабсталяваны для перавозкі гадаванцаў: у салоне ёсць клімат-кантроль, месца для жывёлы і яе гаспадара, насілкі розных памераў для пераноскі траўмаваных жывёл. У службе запэўніваюць, што ўсе кіроўцы заатаксі прайшлі пачатковы курс кіналагічнай падрыхтоўкі. Акрамя гэтага, за пашкоджанне салона не прыменяць ніякіх санкцый. Магчыма і перавозка жывёлы без удзелу гаспадара. Такім чынам, паездка да ветэрынара, грумера, на дрэсіроўку ці злучку больш не павінна быць праблемай.

— Цану паездкі мы разлічваем зыходзячы з нашых выдаткаў, — каментуе **заснавальнік службы Пётр ЯКУШЭНКА.** — Калі кліент тэлефануе ці робіць заказ на сайце, мы адразу ж паведамляем яму суму, якая больш не змяняецца. У сярэднім транспарціроўка гадаванца па сталіцы каштуе ад 12 да 17 рублёў. Цяпер збольшага перавозяць сабак (90 працэнтаў) і катоў (10 працэнтаў). Аднойчы паслугамі карыстаўся гаспадар чарапахі. Быў цікавы заказ на перавозку крумкача, але кліент чамусьці адмовіўся. Нашы магчымасці абмежаваны толькі памерамі кузава, любыя жывёлы (у тым ліку экзатычныя), якія змяшчаюцца ў спецыяльна адаптаваным салоне, могуць быць перавезеныя. Адзіная заўвага — пакуль што мы маем толькі тры аўтамабілі, таму заказ лепш рабіць за некалькі гадзін да запланаванага выезду. Выязджаем і ў іншыя гарады краіны, але гэта, вядома, адбіваецца на кошце.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviada.by*

Даты | Падзеі | Людзі

### 2 ЛІСТАПАДА

**1717** год — нарадзіўся (Браслаўскі павет) Караль Вырвіч, гісторык, географ, педагог. У 1734 годзе ўступіў у ордэн езуітаў, выкладаў у Пінскім і Навагрудскім езуіцкіх калегіумах. З 1757 года выкладаў этыку і гісторыю ў Варшаўскім езуіцкім калегіуме, у 1762—1776 гадах — яго рэктар. Аўтар абагульняючых геаграфічных работ: «Сучасная геаграфія» і «Усеагульная геаграфія». Памёр у 1793 годзе

**1894** год — уступіў на прастол апошні расійскі імператар Мікалай II. Мяккі па характары і нерашучы Мікалай Аляксандравіч Раманаў, 26-гадовы сын імператара Аляксандра III, атрымаў у спадчыну трон 2 лістапада 1894 года пасля раптоўнай смерці бацькі.



**1906** год — нарадзіўся (вёска Пугляі, цяпер у Аршанскім раёне) Дзмітрый Паўлавіч Бяляцкі, беларускі гігіеніст і арганізатар аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук , прафесар, заслужаны ўрач Беларусі. У 1937—1941 гадах — галоўны дзяржаўны санітарны інспектар Беларусі, у 1943—1959-м — намеснік міністра аховы здароўя Беларусі, адначасова (да 1980-га) — загадчык кафедры Мінскага медыцынскага інстытута. Аўтар навуковых прац па арганізацыі аховы здароўя, гісторыі медыцыны. Выявіў залежнасць захворвання сыпным тыфам ад сацыяльных узрушэнняў. Памёр у 1983 годзе.

**1936** год — 80 гадоў таму нарадзіўся Міхаіл Пятровіч Брэнч, беларускі вучоны ў галіне рухавікоў унутранага згарання, педагог, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, заслужаны работнік транспарту. У 1966—1993 гадах выкладаў у Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. Аўтар навуковых прац па аўтаматызацыі функцыянальных сістэм аўтатрактарных дызеляў і іх структурным аналізе.

**1942** год — утворана Надзвычайная дзяржаўная камісія па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў, учыненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі і іх саўдзельнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і вызначэнні нанесенай імі шкоды грамадзянам, калгасам, дзяржаўным установам СССР.

Было сказана

**Янка СІПАКОЎ, паэт, празаік:**
*«Тое, што відаць усім, — кропля, а тое, што павінны былі ўсе бачыць, — не бачна нікому».*

## Які лясгас самы «салодкі»?

### Сёлета лясгасы сабралі амаль 100 тон мёду

**На сёння ў лясгасах краіны маецца больш за 10,3 тысячы вулляў. За сёлетні сезон было атрымана 95,3 тоны таварнага мёду.**

Па таварнасці пчолапасек, дзе было сабрана больш за 20 кілаграмаў карыснага прадукту ад адной пчоласям'і, лідарамі ў гэтым годзе сталі Клічаўскі лясгас (29,3 кілаграма), Старадарожскі доследны (25,4), Талачынскі (24,7), Лоеўскі (21,9), Глускі (21,4), Ельскі (20,9), Капыльскі доследны (20,1) і Смалявіцкі (20 кілаграмаў). Кармавы запас на адну пчоласям'ю ў сярэднім па галіне склаў 19,1 кілаграма мёду, паведамілі ў прэс-службе Мінлясгаса. Да зімоўкі 2016—2017 гадоў лясгасы падрыхтавалі больш за 8,7 тысячы пчоласем'яў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

БЕЛКАРТ Тебе ближе

**СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ**

# «Платеж на удачу»

Организатор рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «Мятный знак». УНП 192325716, 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Чапаева, 3, ком. 101.
Наименование рекламной игры: «Платеж на удачу».
Территория проведения: Республика Беларусь.
Срок начала и окончания рекламной игры: игра проводится с 26 сентября 2016 года по 20 ноября 2016 года.
Сведения о государственной регистрации рекламной игры: игра зарегистрирована в Министерстве торговли Республики Беларусь (свидетельство о государственной регистрации №2819 от 05 сентября 2016 года).
Сведения о количестве участников рекламной игры: в игре приняли участие 4 110 (четыре тысячи сто десять) человек.
Сведения о розыгрыше призового фонда: призовой фонд (261 приз), общий размер которого составляет 10 758 (десять тысяч семьсот пятьдесят восемь) белорусских рублей 31 копейка в денежных знаках образца 2009 года, или 107 583 100 (сто семь миллионов пятьсот восемьдесят три тысячи сто) белорусских рублей в денежных знаках образца 2000 года, разыгран полностью.
Список победителей рекламной игры «Платеж на удачу» опубликован на сайте www.igra.kartochki.by

***Поздравляем победителей!***
Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры:
8 (033) 335 51 10

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 8.12 | 17.33 | 9.21 |
| Віцебск | — 8.06 | 17.19 | 9.13 |
| Магілёў | — 8.03 | 17.23 | 9.20 |
| Гомель | — 7.55 | 17.25 | 9.30 |
| Гродна | — 8.27 | 17.49 | 9.22 |
| Брэст | — 8.23 | 17.54 | 9.31 |

### Месяц

***Маладзік 30.10—06.11.***
***Месяц у сузор'і Стральца.***

### Імяніны

***Пр.*** *Аляксандра, Арцёма, Германа, Івана, Леаніда, Мікалая, Паўла, Пятра.*
***К.*** *Дзяды, Задушны Дзень.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Каціны спіс спраў:**
**1) Гарлапаніць, каб пакармілі.**
**2) З'есці паўміскі.**
**3) Гарлапаніць проста так.**

На дні нараджэння:
— І чаго табе, Макс, такога пажадаць, каб потым не моцна зайздросціць?

**Калі вы сварыцеся, а потым мірыцеся і ўжо праз дзень не памятаеце, з-за чаго лаяліся, — гэта і ёсць сапраўднае каханне.**

**Зрэшты, склероз праяўляецца гэтак жа.**




Малюнак Пятра КОЗІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4285.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 1 лістапада 2016 года.